Год II — Аутарак 10 студня 1922 г. — № 5 (14)

РАНІЦА

штодзенная, грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:
Вільня, Вострабрамская № 4, „Hotel Szlachecki“ пак. № 2.
Рэдакцыя адчыняна што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1 і ад 5 да 7 гадз.

Цана нумару 20 марак.
Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай 1 „ . . 500 „
За граніцай ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . . . : 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 прац. т. ней.

Рэдакцыя газэты просіць п. падпісчыкаў высылаць у пару грошы за газэту. Калі грошы ня будуць адтрымывацца, то высылка газэты будзе затрымана.

Кнтора газэты „Раніца“ паведамляе, што магазынам выпісываючым газэту дзеля прадажы, кантора будзе рабіць 30 проц. уступкі.

Вільня, 10 Студня 1922 г.

Выбарная акцыя ўжо скончылася.

Мы яшчэ ня ведаем лічбы галасоў, паданых за тую ці іншую партыю, але ўсё-ж можам з пэўнасьцю сказаць, што тыя элемэнты, якія вялі процiў выбараў агітацыю, пацярпелі поўнае паражэньне.

Перш усяго сяляне-беларусы, як мы і раней спадзяваліся, ня гледзячы на пастанову „Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту“ і на варожую проці выбараў агітацыю агентаў п. Ластоўскага, усёй сваей масай пайшлі на выбары, аддаючы сваі галасы там, гдзе ня было беларускіх выбарных сьпіскаў — балей усяго партыі „Odrodzenie“.

Аб гэтым сьведчаць нашы карэспандэнты з усіх выбарных вокругаў.

Ні эндэцкая, ні літоўская агітацыі на вёсцы, таксама, ня мелі жаднага ўплыву.

Што датычыцца вясковых жыдоў, дык яны, састаўляючы зусім маленькі процэнт насяленьня, не маглі іграць ні якай ролі ў выбарнай акцыі.

Саўсім іншая справа ў самым Вільні, дзе беларусы—меншасьць, ды і гэтая меншасьць расшчэплена на дзьве варожыя няпрымірымыя групы. Няма нічога дзіўнага, што пры такой сытуацыі, беларусы ў Вільні ня выставілі свайго сьпіску. Але ўсё-ж і ў Вільні з беларусаў не галасавалі толькі: беларускі Нацыянальны Камітэт і іх прыхільнікі Ластоўчыкі.

Што датычыцца жыдоўскага насяленьня Вільні, то яно моцна, трымаючыся сваіх павадыроў д-ра Выгодскага, д-ра Шабада і рабіна Рубінштэйна, стрымалася амаль ня ўсё ад учасьця ў выбарах.

Але і гэтая агульная абстынэнцыя ня павінна пашкодзіць выяўленьню жаданьня большасьці насяленьня Сярэдняй Літвы, жаданьня далучэньня да Польшчы.

Мы павінны помніць, што толькі далучэньне да Польшчы зьвяжэ кавалкі нашай Бацькаўшчыны ў цэлую едынку і абароніць яе ад націску з усходу.

Мы павінны ведаць, што толькі ў лучнасьці з Польшчай, адбудуем нашу родную зямельку, падымем нацыяналяную сьвядомасьць і культуру, і для нас зьявіцца магчымасьць аўтаномнага дзяржаўнага істнаваньня.

Нічога падобнага нам ня можа даць, і ніколі ня дасьць ні адзічаўшая і вырадзіўшаяся духоўна і матэрыяльна Саўдэпія, ні маленькая бяссільная і эканамічаскі бедная Літва.

✦✦✦✦

ТЭЛЕГРАМЫ.

ВАШЫНГТОН 8. I (А. В.). Большасьцю галасоў на канфэрэнцыі прынята пастанова, забараняючая ужываньня ў ваенны час, атрутных газаў. Справа аб агранічэньні збройных сіл у паветру, будзе напэўна разглядацца ў панядзелак.

ХАРКАЎ 9. I. (А. В.). Ідуць пэртрактацыі паміж Савецкай Украінай і Урадам Ангары ў справе заключэньня саюзу.

БЭРЛІН 9. I. (А. В.). Учора зьвярнуўся да Бэрліна Ратгенаў і пачаў канфэрэнціі з Канцлярамі, цягнуўшыміся ажно да позняй ночы. На заўтрашнім паседжаньні нямецкага габінэту Ратгенаў паінфармуе аб сваей паездце.

БЭРЛІН 9. I. (А. В.). Прэса інфармуе нібыто Радек меў доўгую канфэрэнцыю з канцлерам ў справе навязаньня найблізшых адносін гандлево-палітычных Нямецко-Савецкіх і разам аб адбудове Расеі.

СТАКГОЛЬМ 9. I. (А. В.). Швэдцкі камітэт помачы Расеі, прапанаваў, сваму парлямэнту, асігнаваць яму мільён шв. карон апрыч ім ужо адтрыманых на гэтую справу.

КАННЫ 9. I. (А. В.). Апрацованы варункі, на якіх бальшавікі маюць права прыймаць удзел у канфэрэнцыі, ззыванной вялікімі дзяржавамі ў справе расейскай і международных адносін ў Эўропе.

Гэные варункі патрэбуюць ад Расеі адрачэньня ад галоўных пунктаў сваей праграмы.

МАСКВА 8. I. (А. В.). Прэса саветаў падробна разглядае праэкт адбудовы Расеі, праз ўсходне эўропейскае таварыства. Стеклоў ў „Ізвесьціях“ нападае на гэны плян, называе яго плянам удушэньня Савецкай Расеі, асабліва з поваду прыняцьця учасьця ў адбудове Японіі і Францыі.

МАСКВА 9. I. (А. В.). „Ізвесьція“ пішуць аб надужыцьях у літоўскім пасольсьцве.

Пад відам багажу дэлэгатоў з літоўскімі печаткамі. З Бэрліна да Масквы прывазіліся вялікія партыі сахарыну і какаіну, ўзварот з Масквы літоўскае пасольства вывозіло брыльянты, золато і каштоўныя манеты.

КАТАВІЦЕ. 8. I. (А. В.). У суботу Голендэр прыняў прадстаўнікоў польскай прэсы, застаўся вельмі зацікаўлены справай і шчыра іх дзякаваў.

✦✦✦✦

Нашы ворагі.

(Ліст у рэдакцыю,)

У газэце-аднаднёўце „Голас Грамадзяніна,“ якая выйшла ў Вільні 6 студня г. г. зьмешчана стацьця „Ворагі беларускай справы.“ У гэтай стацьці, між іншым, гаворыцца аб тым, што сябра прэзыдыуму Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту п. Уладзімір Пракулевіч, які ў часе Слуцкага паўстаньня быў Старшынёй Рады Случчыны, скраў 10.000 ням. марак у той час калі Случакі, гінулі ад голаду і тыфусу.

Справа гэтая мае сваю гісторыю.

Яшчэ 18 мая мінулага году, на сходзе часткі сябраў б. Рады Случчыны, Ваенны Следавацель 1-ае Слуцкае Брыгады п. К. зрабіў даклад аб тым, што п. Пракулевіч, як Старшыня Рады Случчыны, атрымлівае грошы на Раду й што, між іншым, у апошнія дні ён атрымаў 5.000 ост марак. Ня гледзячы на тое, што грошы гэтыя былі адрасованы на Раду Случчыны, п. Пракулевіч нікога з сябраў Рады не паведаміў аб атрыманьні гэтых грошаў, а моўчкі паклаў іх ў сваю кішэню. У рэшце была зроблена пастанова — склікаць сход усіх прысутных у Вільні случакоў й патрэбаваць ад п. Пракулевіча адчоту.

Сход гэты адбыўся 28-га мая.

Калі быў прачытаны пратакол сходу ад 18 мая, то п. Пракулевіч даў адказ, што грошы, у ліку 5.000 ост-марак, ён запраўды атрымаў, але падкрэсліў, што нібыта грошы гэтыя былі адрасованы не на ўсю Раду, а толькі на „сацыялістычную“ частку яе. Калі далей была высьветляна, што гэта няпраўда й, што грошы былі прысланы проста на Раду Случчыны, Пракулевіч усёж-ткі адмовіўся даць адчот і дэманстрацыйна пакінуў сход.

На гэтам сходзе была зроблена пастанова — давясьці да ведама ўсіх беларускіх устаноў аб тым, што Рада Случчыны ў сучасны момэнт не істнуе й, што ніхто ня мае права ад яе імя атрымліваць грошы.

Копія гэтага пратаколу ў свой час была паслана й ў Віленскі Нацыянальны Камітэт, але дзякуючы таму, што п. Пракулевіч быў у добрых адносінах з некаторымі сябрамі прэзыдыуму гэтага Камітэту, яму удалося гэтую справу замяць.

І вось, у канцы г. году, пры перавыбарах Нацыянальнага Камітэту, ня гледзячы на тую цень, якая была кінута гэтай справай на п. Пракулевіча, яго ня толькі выбіраюць сябрам прэзыдыуму, але яшчэ й даручаюць пасаду скарбніка Камітэту.

Відаць добрая кампанія сабралася у гэтым камітэце.

С л у ч а к.

Весткі з Варшавы.

(Па тэлеграфу).

Пражываючыя ў Польшчы Украінцы, арганізавалі Эміграцыйны Камітэт.

* * *

Польская дэлегацыя, з мешанай гранічнай камісіі з п. Васілеўскім на чале выехала да Масквы дзеля таго, каб залацьвіць справу аб польска-расейскай граніцы.

* * *

Генэрал Жэлегоўскі выехаў з Варшавы на кароткі час да г. Торуня.

* * *

Контроль багажу ў Тчэве, на граніцы польска-гданскай, будзе рабіцца яшчэ да кветня г. г.

* * *

Францускі пасланік у Варшаве Панафье злажыў міністру загранічных спраў п. Скірмунту асьвядчэньне аб адбудове Расіі.

У гэтым асьвядчэньні гаворыцца: я ўпаўнамочаны закамунікаваць польскаму ўраду, што Францыя праконана ў тым, што калі міжнародны праэкт аб адбудове Расіі будзе праводзіцца у жыцьцё, дык учасьце Польшчы ў гэтай акцыі будзе нямінучым.

Нікчэмнасьць нашых ворагаў.

Змаганьне беларускіх груп і партыяў перайшло граніцы таго, што завецца ва ўсім культурным сьвеце прызваітасьцю. Гэта ужо ня ёсьць ідэёвал барацьба рожных напрамкаў палітычнай мысьлі. Гэта ня ёсьць змаганьня за пэўныя ідэалы, а звычайнае вулічнае лаяньне.

Хочацца застанавіцца на хвілю над гэтым зьявішчам, прааналізаваць яго сутнасьць. І вось тут як—раз і прыходзіць тая сумная думка, над якою трэба б было падумаць асабліва тым, хто так многа і яра крычыць аб нашай незалежнасьці.

Гляням на наша сягоньняшняе, штодзеннае жыцьцё і нас, калі будзям хоць на хвільку аб'ектыўнымі, ўдарыць страшэньне нізкасьць і нікчэмнасьць матываў тых, хто так хоча каб іх лічылі другія і лічуць сабе самі павадырамі беларускага народу і вяршыцялямі яго лёсу.

Атупелыя ў барацьбе асабістай, агрубелыя ў вузкапартыйных паглядах, яны здольны толькі на адно: зноў прынясьці народу новыя кайданы.

Незалежнасьць—гэта вышшая правя моцы народнага духу; насіцялі яе, і яе сымвал—лепшыя сыны гэтага народу, якія ў дзяржаўным разуменьні яго правоў умеюць стаць на высату орляга палёту.

Ня здабыць Вольнай Беларусі тым, што стаўшы наймітамі чужацкай сілы аднімаюць у народа самае цэннае ў ім —яго істотную вартасьць, дух праўдзівай народнай вольнасьці.

Ня падняць народнага духу тым, што адзеўшы духоўныя адзежы, зыйшлі с шляху Хрыстовай праўды, і пайшлі дарогай вузкамешчанскай, дробнабезразборчай асабістай барацьбы.

Апошнія нумары апошніх лістовак, гэтыя шэдэўры цартыйна — наймiцкай тупасьці, міма іх можна прайсьці да парадку дзеннага, — гэта той грозны кансэквэнтны аналіз, які з гэтай зьявы выводзіць адно: мы ня дарасьлі да вялікіх дзён вялікіх дзеяў, мы ня асілілі таго, што завецца дзяржаўнасьцю.

У гэтыя дні, гэтыя сумныя годы, мы ўздвояннай энэргіяй павінны павясьці нашу нацыянальную працу, будзіць да сьвядомасьці маладое пакаленьне, якое, ўстрошшы з сябе затхласьць і скарупу цяперашніны, возьме сьветлую нацыянальную справу ў чыстыя моцныя рукі.

Мы верым, што чыстату гэтае ідэі перахаваем, што плямы на ей мы змыем.

Адкрыты ліст генэрала Балаховіча.

„Gazeta Wil." піша: „генэрал Булак-Балаховіч прыслаў адкрыты ліст да Беларускага нацыянальнага Камітэту, ў якім зьвертае увагу грамадзянства, што група гэтая, адмаўляючая цяпер ад галасаваньня ў Віленскі Сойм, ужо ў прошлым гаду, ў час бальшавіцкай інвазыі, клікала насяленьне стрымацца ад уселякай збройнай акцыі проці бальшавікаў, многа шкодзіла генэралу Балаховічу і была адной з прычын таго, што ён ня мог выкарыстаць палітычную сытуацыю таго часу на карысьць Польшчы і Беларусі.

Дзейнасьць „Беларускага Нацыянальнага Камітэту", генэрал Балаховіч характэрызуе такімі словамі:

„Многія з' іх кінуліся на адбудову Савецкай Беларусі пры дапамозе чрезвычайкі, а іншыя з гэтай групы засталіся у Варшаві і на Крэсах, гдзе зусей моцы стараліся паралізаваць маю дзейнасьць, кажучы, як і камуністы,—што вядуць барацьбу дзеля сваіх спэцыяльных заданьняў.

Сягоньня, калі гэтыя самыя „дзеячы" зноў асьмеліліся выступіць з сваімі „пастановамі", я павінен узяць голас, каб асьцярагчы легкадумных: Хай ідуць вон! Мейсца іх у Бэрліне, альбо ў Саўдэпіі! З іх ласкі мы цярпелі на фронце; праз іх Беларусь яшчэ і цяпер стогне пад ігам савецкім!"

Генэрал Балаховіч канчае свой ліст засьвядчэньнем, што ён зараз же з некалькімі тысячымі сваіх ахвотнікаў-беларусоў, якія біліся разам з палякамі проці бальшавікоў, паедзе ў Віленшчыну да выбарных урн дзеля таго, каб зямля гэта была далучана да Польшчы.

Навіны у тры радкі.

Савецкая Улада ўручыла эстонскаму паслу ў Маскве ноту з пратэстам проці аказаньня дапамогі карэльскім паўстанцам.

Курс польскай маркі, на тэрэнах Савецкай Украіны, пайшоў у гару. У апошні час польская марка падняласи на 100 проц.

У Саўдэпіі, ў губэрніях: Тамбоўскай, Саратаўскай і Царыцынскай пашыраецца паўстаньне пад павадырствам Антонава. Насяленьне ахвотна пастуцае ў шэрэнгі паўстанцаў.

Беларускі Рэфэрэнт пры Дэпартамэнце Прасьветы Сярэдняе Літвы зьліквідаваны. Рэфэрэнт грам. Тарашкевіч ад службы звольнены.

Паўстанцы ў Карэліі пад націскам 50000 бальшавіцкай арміі адходзяць. Бальшавіцкія газэты пішуць, што паўстаньне ў хуткім часе будзе ліквідавана.

ХРОНІКА.

Прыезд Начальніка Панства.

8 сьнежня ў Вільню прыбыў Начальнік Панства п. Пілсудскі, апусьціў свой голас у ўрну і зараз-жа адбыў у Варшаву.

Паварот п. Аляксюка.

Пасьля галасаваньня Віцэ-старшыня Краёвай Сувязі п. П. Аляксюк вярнуўся з г. Ашмяны ў вечару 8 сьнежня.

Генэрал Балаховіч.

У Вільні на некалькі гадзін затрымаўся, едучы ў Браслаўскі павет на галасаваньне, генэрал Балаховіч.

Ён вельмі бодра глядзіць на будучыну і спадзяецца, што наступіўшы новы год прынясе многа добрых і карыстных навін для нашай Бацькаўшчыны...

Генэрал Балаховіч успаэла на старане тых, хто жадае далучэньня Сярэдняй Літвы да Польшчы і лічыць, што ўся агітацыя проці Сойму робіцца на нямецкія, альбо бальшавіцкія грошы.

Маленькі фельетон.

Мой сон.

Мне сьніўся сон.

Быццам я зноў у сваёй роднай хаце. Каля мяне жонка, пара дзяцей.

Але ж, Божачка мой, як яны зьмяніліся!

Жонка ўжо саўсім старая, дзеці—вялізарныя. Прайшло шмат гадоў, як я быў у хаце і дзеці мяне не пазнаюць, - чураюцца.

Жудасна мне зрабілася. Ці ж гэта праўда, мая сямейка? Я ужо ёй саўсім чужы...

Сколькі гадоў я чакаў той хвілінкі, калі зноў апынуся сярод сваіх кроўных, радных... і ось што мяне спаткало!

Жудасна...

Я ня вытрымаў і... заплакаў...

— Чаго ты? Што з табой? — падходзе да мяне жонка і ўзяла мяне за плячо...

Я падняў галаву і... прабудзіўся.

Перэда мной стаяў такіж небарака як і я, які заставіў там у „Саўдэпіі" ўсю радню, і тутака матаецца адзін...

— Чаго ты, супакойся!

— Так гэта ты? Так гэта толькі сон?

— Які?

Я разказаў.

Да, гэта быў толькі сон. Але каб яго запраўды ня было, нам трэба тутака на чужыне працаваць, а не сядзець, склаўшы рукі.

Усе да працы, да супольнай працы, ратаваць сваю Бацькаўшчыну ад маскаўскай навалы. Нам ніколі няма павроту да роднай хаты, пакуль там гуляюць бальшавікі...

Так ня сьпіце же, каб Вам ня прысніўся гэтакі-ж сон!...

Чуеце Вы гэтай мае браты партызаны? Колі чуеце дык гэй да працы!

Паляшук.

КАРЭСПАДЭНЦЫІ.

М-ка Засьвір.

(Сьвенцянскага павету)

У Засьвіры ў апошні час вялася літоўскімі агентамі моцная агітацыя проці выбараў ў Сойм. Але, як толькі прыехаў інструктар па выбарам, пачаў гутарку аб Сойме і высьвятліў ашуканства Ластоўшчыкаў, сяляне зьмянілі сваі адносіны да выбараў і гу̂стой масай пайшлі да выбарных урнаў.

К—ч.

М-ка Смаргоны.

(Ашмянскага павету)

Насяленьне Смаргонскага вокруга вельмі прыхільна адняслося да выбараў. Ужо з раніцы 8 студня народ пачаў зьбірацца ў мястэчку. каб падаць свой голас. Зьявіліся агенты Ластоўскага і павялі таемную агітацыю проці Беларускага сьпіска № 6.

Ст. Альшэва.

5 сьнежня каля станцыі Ольшэва у цягніку, адпраўляўшымся у Канстантынова два астатніх вагона сайшлі з рэльсаў. Катастрофа была нямінучай, бо ў перадзі стаіць мост, праз каторы павінен быў ісьці цягнік. Але машыніст у час даглядзеў сход з рэльсаў і затрымаў каля самага маста цягнік.

Па прычыне сходу з рэльсаў — зламалася стрэлка.

Пры дапамозе пасажыраў вагоны былі пастаўлены на рэльсы і цягнік адправіўся далей. Пацярпеўшых, акрамя страху, ня было.

На узкакалейнай лініі Ново-Сьвенцяны—Шемятова вялікія сьнежныя заносы. Цягнікі ідуць з апазданьнем.

К—ч.

г. Сьвенцяны.

У гэтым годзе ў Сьвенцянскім павеце надта разьвяліся ваўкі, якія робяць многа шкоды. Па вёсках людзі жаляцца, што ваўкі крадуць сьвіней, авечак і жарабят.

Па начам ваўкі задаюць такія канцэрты, што людзі палохаюцца ехаць у дарогу, як толькі сьцямнее.

Стэнаграма З'езду Заходняй Беларусі.

(Глядзі з 1 да 7 № „Раніцы").

Дрэнна са школамі, дрэнна й ва ўсіх другіх справах. Тутака толькі не гаварылі яшчэ аб адной вельмі важнай патрэбе—гэта аб патрэбе бальніц, аптэк, дактароў. А яны патрэбны вельмі, бо людзі уміраюць і дапамогі за колькі дзясяткаў вёрст ня знайдзеш... У нашым Краі ёсьць вялікія багацтвы—гэта лес, каторы цяпер прадаецца ўласьнікамі на права і налева. Пакуль у нас ня зроблена зямельная рэформа—нельга дазволіць, каб Улада з гэтага лесу будавала школы і бальніцы, але, калі нейкія Акцыянерныя Таварыствы пачынаюць латашыць гэты лес і набіваць свае кішэні—гэтага дапусьціць нельга!...

Петкевіч (прэдстаўнік студэнтаў): мо для нас студэнтаў беларусаў выпала лепшая доля, як для другіх нашых братоў. Мы маем магчымасьць вучыцца. Але мы вышлі з народу, які цяпер яшчэ застаецца ў цемры і мы заўсёды будзем ісьці на перадзі, каб вывясьці наш народ да сонца, да сьвету.

Жыцьцё ў нашым унівэрсытэце нармальнае. Німа такой грызьні паміж студэнтамі беларусамі і палякамі, як гэта ёсьць у Львоўскім унівэрсытэце паміж палякамі і украінцамі.

У нас з,арганізаваны беларускі студэнскі саюз, які мае мэты нясьці нашаму народу асьвету і будзіць яго да сьвядомага нацыянальнага жыцьця.

Цяпер, я хацеў-бы прасіць вас: высьвятліць на гэтым з'ездзі справы аграрную і школьную...

Старшыня: Даклады аб аграрным, пытаньні будуць пасьля.

(Студэнт заявляе, што ён тагды возьме слова і адыходзіць на сваё мейсьца).

Каспэровіч: (Ад Ашмянчыны). Сяляне Беларусы! Я, як прэдстаўнік Ашмяншчыны, хачу вам сказаць аб нашым павеце колькі слоў. Я хачу сказаць вам аб тых больках, якія мы пераносім, мы, селяне-беларусы. Наша жыцьцё вам усім ведама,—сядзімо сабе ў заканурах і чакаемо пакуль нас хто вывядзе на вольны шырокі шлях. Мы, ашмянчукі даведаліся, што ў Вільні адбудзецца з,езд і я ў ліку другіх, як выбарны прыехаў сюды, каб разсказаць Вам аб нашых жаданьнях. Тут шмат гаварылі аб школьнай справе. Гэтая справа надта балючая, горкай крыўдай яна раз'едаецца у сэрцы кожнага беларуса. Усе народы культурнага сьвету маюць свае нацыянальныя школы, маюць права ужываць сваей роднай мовы — толькі мы, беларусы, чамусьці, гэтых школ ня маем, ня маем права адзывацца той мовай, якой мы навучыліся ад калыскі, роднай мовы, перададзенай нам ад даўных і слаўных прашчураў. Але трэба спадзявацца, што гэта часовае непаразуменьне. Польскі народ і яго урад —нелапусьцяць гэтага. Беларусы будуць мець свае правы і свае школы!

Мы, ўсе Ашмянчукі, жадаючы сваей лепшай будучыны, пойдзем цьвёрдаю ступою за тымі, каторыя простаю дарогаю павядуць нас да лепшай будучыны. Мы, не зважаючы на злачынствы мяйсцовых дробных польскіх чыноўнікаў, верым у братскія пачуцьці польскага народу і рука воб руку пойдзем з ім заваёўваць свае правы.

Ад імені Ашмяншчыны вітаю гэты з'езд, каторы стаў на гэты шырокі беларуска — польскі шлях, які павядзе нас да волі і лепшай долі! (Вокляскі.)

(Далей будзе).

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч

Друкарня „Друк" Субач 2.